■ Наш фармат

...Каб касцюмчык сядзеў

У Мінску можна будзе бясплатна засвоіць асновы кройкі і шыцця

Бывае, вырашыш абнавіць гардэроб, а знайсці патрэбную рэч не пашанцуе: тут крыху задоўга, там тапоршчыцца, тут моршчыць і проста не сядзіць па фігуры. Добра, калі здольнасці дазваляюць самому падкараціць джынсы або пашырыць сукенку — а калі не, трэба звяртацца ў майстэрню і абноўка ў выніку падаражэе, часам істотна...

Мінчанка Вольга Кастузік такой бяды не баіцца — па першай адукацыі яна закройшчык, і з задавальненнем шые для сябе і сям'і. Затое сутыкнулася з іншай праблемай: «У мяне маленькі сын, якому яшчэ няма двух гадоў, — у дзіцячы сад ён пакуль не ходзіць, і мы ўвесь час разам. А паколькі малы ў мяне жвавы і гарэзлівы, то, калі я саджуся шыць, можа схапіць тканіну і збегчы альбо адбірае нажніцы, іголкі... Гэта не толькі непрыемна, але і небяспечна. Я падумала: вось бы было такое атэлье, куды б мяне пускалі часам шыць для сябе! Безумоўна, можна набыць бытавую швейную машынку, — але каб шыць якасныя рэчы, хочацца мець аверлок, прас, машыну для трыкатажу, манекены, раскройны стол — дзе ўсё гэта размясціць у кватэры?» Параспытаўшы знаёмых швачак і мадэльераў, Вольга зразумела, што ў сваіх марах далёка не адзінокая. І вырашыла: калі падобнай паслугі — адкрытай швейнай майстэрні — у Мінску не існуе, значыць, трэба яе стварыць!

Ідэя праекта «На ўсю катушку» — творчая прастора з прафесійным швейным абсталяваннем, якім могуць карыстацца ўсе ахвотныя для шыцця або рамонту адзення. На дапамогу нявопытным краўцам будзе прыходзіць прафесіянал-тэхнолаг, а пачаткоўцаў, якія толькі і ведаюць, дзе ў іголкі востры канец, Вольга плануе навучыць асновам кройкі і шыцця — абсалютна бясплатна. «Спачатку думала зрабіць усе паслугі платнымі, але потым зразумела, што многія папросту не прыйдуць, бо не ўмеюць шыць на машынках, таму трэба забяспечыць не толькі высокі ўзровень сэрвісу — дапамога майстра, інструменты, модныя часопісы, лякалы, бясплатныя чай-кава, — але і прывабіць як мага больш наведнікаў, таму вырашыла зрабіць бясплатнае навучанне для навічкоў. Хтосьці з іх будзе потым шыць дома, але частка вучняў, упэўнена, вернуцца да нас».

Падобныя швейныя каворкінгі (ад англійскага coworking, «сумесна працуючыя» — рабочая прастора з неабходным абсталяваннем, якая здаецца ўсім жадаючым у арэнду на неабходны тэрмін — ад некалькіх гадзін да некалькіх месяцаў) ужо існуюць у Расіі і Украіне, а вось для Беларусі падобны вопыт у навіну.

— Шчыра кажучы, не разумею, чаму ў Мінску гэтага няма. Калі ў сацыяльных сетках я пацікавілася, ці гатовыя людзі бясплатна вучыцца шыццю, за некалькі дзён да мяне «пастукаліся» паўсотні чалавек, — заўважае Вольга Кастузік. — Прычым сярод іх аказалася надзіва шмат мужчын. Потым муж расказаў, як ён прышывае гузік, і ўсё стала зразумела. Ён, як многія мужчыны, не ўмее рабіць вузельчык на нітцы, таму робіць некалькі хаатычных шыўкоў са споднягa боку. Трымаецца, паводле яго слоў, намёртва, але як выглядае такі «павук»... Так што цяпер планую адкрыць міні-курс для мужчын: як зашыць разрыў, прышыць гузік, правільна адпрасаваць кашулю і г. д.

...Падобны бізнес хоць і мае сацыяльны кірунак, усё адно патрабуе немалых укладанняў. Хтосьці займае грошы ў сваякоў, хтосьці бярэ крэдыт у банку. Вольга ж звярнулася на краўдфандынгавую пляцоўку (гэта калі людзі праз інтэрнэт падтрымліваюць грашыма цікавыя ідэі). Заказаць абанемент у будучую майстэрню можна на платформе ulej.by. Калі да 1 ліпеня збярэцца патрэбная сума, то ўжо ўвосень майстэрня прыме першых наведнікаў. Сачыць за ходам праекта і больш даведацца пра яго таксама можна на сайце katushka.by.

«Насамрэч вельмі прыемна, што ідэя ўжо знайшла водгук у некаторых кампаній-партнёраў — атэлье «Проста Марыя», музея мініяцюр «Краіна міні», які прадставіць сваю тэрыторыю для майстар-класаў, — з асцярожным аптымізмам расказвае Вольга. — Таксама прадумваем варыянты супрацоўніцтва з брэндамі швейных машын, крамамі тканін і фурнітуры, інтэрнэт-крамамі. Да нядаўняга часу «На ўсю катушку» — гэта была я адна ў многіх асобах, цяпер ёсць памочніца-прафесіянал, спадзяюся, з'явяцца і іншыя».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
tselyashuk@zviazda.by

Фота з асабістага архіва аўтара праекта

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 19 красавіка. Месяц у сузор'і Вадалея.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.57	20.21	14.24
Віцебск —	5.44	20.14	14.30
Магілёў —	5.47	20.11	14.24
Гомель —	5.48	20.04	14.16
Гродна —	6.13	20.35	14.22
Брэст —	6.17	20.32	14.15

Імяніны

Пр. *Акуліны, Гаўрылы, Георгія, Данілы.*
К. *Агнешкі, Амаліі, Тэадора, Часлава, Шымана.*

Фота Максіма ШАСТАКОВА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Ранкам паставіла будзільнік на рана, каб пабегаць. У выніку а 5-й раніцы я адключыла будзільнік і працягнула спаць, але мне прыснілася, што я бегаю.

— Разумееш, я за здаровае харчаванне: цэльназерневая ежа, гародніна, нізкае ўтрыманне вуглеводаў.

— Каньяк будзеш?

— Так.

Сусед учора прыйшоў з просьбай на яго не крыўдзіцца наступнымі днямі, прынёс торт і сказаў, што будзе рады чуць маю любімую музыку на ўвесь гук у любы час дня і ночы. Сёння пачаў свідраваць сцены.

— Цяпер, як сапраўдны мужчына, вы проста абавязаны са мной ажаніцца!

— Спадарыня, як сапраўдны мужчына, я ўжо жанаты!

Рыбак-сведка сцвярджаў, што заўважаны ім злачынца быў чатыры з паловай метры ростам і вагой кілаграмаў трыста.

Даты Падзеі Людзі

20 КРАСАВІКА

1917 год (20—30 красавіка) — у Мінску адбыўся 1-ы з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту.

1927 год — нарадзіўся Луспякаеў Павел Барысавіч (1927—1970), расійскі акцёр, заслужаны артыст РСФСР. У фільме «Белае сонца пустыні» выканаў ролю Верашчагіна. Здымаўся ў карцінах «Цягнік міласэрнасці», «Доўгае шчаслівае жыццё», «Такая доўгая, доўгая дарога», «Жыццё Мацвея Кажамякіна» і інш.

1934 год — першае прысваенне звання Героя Савецкага Саюза семярым лётчыкам, якія выратавалі экіпаж парахода «Чалюскін».

1942 год — завяршылася Маскоўская стратэгічная аперацыя, адна з найбуйнейшых аперацый Вялікай Айчыннай вайны. У ходзе гістарычнай бітвы за Маскву савецкія войскі ўпершыню за ўсю Другую сусветную вайну нанеслі буйное паражэнне арміі фашысцкай Германіі, развеяўшы міф аб яе непераможнасці.

1947 год — нарадзіўся Смаляк Віктар Мікалаевіч (г. Рэчыца Гомельскай вобл.), беларускі мастак-плакатыст. Працуе ў жанрах палітычнага, тэатральнага, рэкламнага плаката. Сярод іх: «Кветка шчасця», «Графіка», «Народнае мастацтва», тэатральныя плакаты для Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра Беларусі.

1957 год — дзень нараджэння дзіцячага літаратурна-мастацкага часопіса «Вясёлка». Разлічаны на дашкольнікаў і вучняў малодшых класаў. Друкуе апавяданні, вершы, казкі, нарысы беларускіх пісьменнікаў, пераклады твораў пісьменнікаў замежных краін, песні беларускіх кампазітараў для дзяцей, рэцэнзіі на новыя кнігі, найлепшыя работы дзіцячай літаратурна-мастацкай творчасці, загадкі, рэбусы, галаваломкі, задачы для дапытлівых і кемлівых.

1962 год — Петрусю Броўку прысвоена званне народнага паэта Беларусі, Міхасю Лынькову — народнага пісьменніка Беларусі.

Было сказана

Кастусь КІРЭЕНКА, беларускі паэт:

«Жыццё выпрабоўвае гневам і болем,
І сумам цяжкім, і жалобаю стратнаю.
І шчасце — калі пад нягодай любою
Ты чуеш падтрымку сардэчную, братнюю».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1481.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 красавіка 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12